

# КОЛА

№ 8 (164) 26 САКАВІКА 1991 ГОДА

ЛІТАРАТУРНЫ ВЫПУСК ГАЗЕТЫ
«ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ»
ГрДзУ імя Я. КУПАЛЫ

Зміцер САНЮК

## ШЛЯХІ ДА БОСКАГА

Зборнік вершаў «Шлях» уражвае сваёй шматколернасцю, бо ў ім сапраўды сышліся розныя шляхі паэтычнага натхнення. І мне хацелася б звярнуць увагу не на творчае майстэрства аўтараў, а на іманентны эстэтычны змест маладой паэзіі. Калі майстэрства — справа часу, то экзістэнцыя паэзіі (а не сама паэзія) незалежныя ад штодзённасці і творчага вопыту. А калі залежнасць такая існуе, то яна прыніжае мастацкі пошук, дэфармуе талент, зводзіць яго да ўзроўню прымітыўнага «рэалізму» альбо форматворства, ігнаруючы эстэтыку вечных ісцін. Вось такім «вокам» я і буду пазіраць на паэтычны альманах «Шлях».

Першапраходцам на гэтым шляху стаў Юрась Пацюпа, які і адкрывае зборнік. Эстэтыка паэта нясе ў сабе тую парадаксальнасць, што ёсць не толькі частка, а цэлы тып свядомасці. Сама па сабе элементарная з ´ява, якую можна назіраць мільёны разоў, атрымоўвае неўласцівы ёй, на першы погляд, вялікі сэнс, і ўпiтаецца ў структуру «прытчы».

Крок наўзбоч — і пасецца
трава,
ідуць баба, карова і кот,
нібы троіца ці радня,
і сядаецца месяц на плот.

Адчуванне цэлага «космасу» хутара ў аднайменным вершы ўзнаўляе своеасаблівае загадкавае быццё, калі побыт выконвае функцыі не рэчыўнага, а ўнутранага свету і любы знешні факт — праява вышэйшага стану духу. У Пацюпы эмпірыка перастае быць і прадметная дэталізацыя страчвае сваё другаснае значэнне, набліжаючыся да першазданнага ўспрыняцця рэчаіснасці, дзе можа нават «стаць час» і «пазяхаць стары бот». І такі выбар паэта становіцца сапраўды сімвалічным, і таму для яго:

Гэты шлях не намацаць
рукою.

Шлях Юрася Пацюпы — перадумова новага паэтычнага светатварэння:

Усё было так няйначай усё
было пакуль
не аб ´езджаны бліскучы
буланы стэп
да стварэння свету.

Для паэта пасля стварэння свету іменна ўсё перастае быць. Пачынае сваё існаванне часткова разарваная тоеснасць. Знікае адчуванне гармоніі цэласнасці і ўзнікае абсурднае пачуццё няўласнага жыцця, калі мы — не мы, і свет — не свет. І нават народнае мастацтва:

гэта ўсё анямелы, да дробнай пылінкі тэатр,
дзе згубілі не толькі ключы,
а канцы і пачаткі,
дзе паблыталі маскі...

І гэта не прымха Пацюпы, а адбітак таго існавання, у якім мы ўсе знаходзімся. Нейкая фатальная сіла «шляху» («Эпічны шлях») рухае нас да «вялікай мэты», але «нічога туды не сягала, усё рассыпалася, і па тракце валяліся косці і ачарэпкі», а дзесьці «ля самае мэты — сіняя птушка», што на самай справе толькі мёртвая цень. І нават сіла цемры, «сляпы крот», не па сваёй волі і нічога «незразумеўшы» вітае недарэчнасць існавання.

Песімізм Пацюпы апраўданы ў даным выпадку, хоць і аддае ад яго сумненнем у боскасці свету. Паэту хочацца новых альтэрнатыў духоўнасці, але ж вышэй ужо нічога няма. Пошук ніхто не адмаўляе, сумненні не шкодныя, бо вядуць да вышэйшага разумення. Пацюпа праз к сцвярджэнню абсалютных ісцін. І пошук яго трэба ўспрыняць як плён, бо шлях Пацюпы праз нігілізм існуючага свету да трагічных ісцін — да боскага ў сабе і ў свеце.

Свой адметны шлях на паэтычным небасхіле акрэслівае і Едрусь Мазько. Як гранічна шчыра рэфлексуе яго лірычны герой:

Я стаўся пустым,
я пайшоў у пусты свет,
я сустрэў пустых людзей...

«Пустэча» для Едруся Мазько — сімвал такога ж значэння,



як і «шлях» для Пацюпы. І гэта не дэкларацыя, не проста вершатворства, а гэта сам дух паэта шукае выйсця з трагедый жыцця:

Калі я заблудзіўся ў сук-
веццi пустаты
І, як вар ´ят, са жмені
піў пясок,
глядзелі людзі на мяне.
У іх вачох жыў здзек.

Такі выхад дадзены любому чалавеку, у тым ліку і паэту Едрусю Мазько і яго лірычнаму герою:

і Храм убачыў на сваім
шляху, я зразумеў тады —
душа мая сваю тут століць
смагу.

Праз пустэчу, праз нявер ´е да сэнсу і веры — вось шлях любога паэта-гуманіста. А інакш высунецца новая вера, накшталт злачыннай веры так званага «атэізму», і будуць «пустыя вочы» і будзе «бессаромны гвалт, на які ніхто не звяртае ўвагі з нагоды поўнай бессэнсоўнасці». Бо хіба ж мае сэнс, «калі на дарогу ўпала дрэва», якое «не вытрымала танцу веснавой пяшчоты». Тады ўвогуле губляецца сутнасць існавання. Калі ад любові, дабра, кахання, шчырасці і цяпла будзе ісці ў «нябыт» усё жывое, то дзе ж тут сэнс. І чалавек, які «павінен быў даўно ўпасці...», няўжо ён не ўпаў! Падзенне адбылося, а гэта і ёсць небыццё. Ісціннае быццё — праз боскасць, міласэрнасць і чалавечнасць. Астатняе ўсё — нябыт. І ў гэтым страшэнным неіснаванні ўсе мы. І дрэва, што ўпала ад танцу веснавой пяшчоты, ці не апалагічнае здарэнне той з ´яве, калі Фёдар Дастаеўскі мог страчваць прытомнасць ад духоўнай прыгажосьці жанчыны! Ці не адзінае тут штосьці, хоць і досыць markdown рознае. Тут не важна ўжо чалавек ці прырода, калі існуе такая суцэльнасць, дзе трагедыя адзінокага дрэва і ёсць трагедыя самога чалавека.

Роздумнасці і філасофскаму падтэксту вершаў Едруся Мазько не заўсёды хапае вынашанасці і вытанчанасці, выпакутаванасці і эстэтычнай меры. Калі паэт дэкларуе:

Гора табе, пустышка,
ты першая ўнесла пустэчу ў
маю душу...



## Едрусь МАЗЬКО

* * *

Л. А. ГЕНІЮШ.

Скрыжаванні дроту
калючага
абразок
уросшы ў скарынку хлеба
пасярод маладосьці...
Усё там,
дзе воблакі п 'юць з завеі,
ня высыхаюць сьлёзы
змарожаных кедраў...
А можа тут,
дзе сонца,
падворак парэзаны
палыном
і сьпісаная кімсьці песьня?..

* * *

### ВЕРУ

Веру ў тваю пераможную
веру
пусты пакой
і халодны ложак
і кубак недапітай кавы
што сплывае ў мокры вечар
з блаславеньня сьцёртых
кружэлак

веру ў тваю пераможную
веру
сівы сон габрэйскіх халупак
маўчаньне званоў
і ў цікаўных суседзяў
што маюць мэблю
ды некуп купілі дзяцей

веру... веру... веру...
табе
тваім вачам
і простым словам
тваёй падзякі

* * *

### ЭРАС

Мокры вецер халоднага
мора
накрывае сьвет электрыч-
насьцю
Аголеная жанчына,
не пасьпеўшы прытуліцца
да маіх вуснаў,
прарастае забытым арэхам
і пакрываецца белым
лісьцем...

І зноў па начох
Я буду сьніць вогненную
Афрыку,
дзе зморшчаная зямля
ня прагне ўзрасьціць
усё жывое
і можна ўдосталь наталіцца
каханьнем.

### ДЭК — 251

Дэмантаж,
Электрычнасьць,
Кірзавыя боты
І поўныя вусны інтэрмовы.
Усё гэта памалявана
ў колер дзіцячага памёту,
нават пустыя вочы...
А зь верху—
ньюэйфелевая вежа
штомінутна заводзіць
спрэчку
з аголенымі таполямі.
Адбываецца бессаромны
гвалт
на які ніхто не звяртае
ўвагі
з нагоды поўнай
бессэнсоўнасьці.



* * *

Твой нябыт — гэта казачны
замак,
апанаваны чароўным сном
і ўзведзены мною з пяску
на беразе мора

Твой нябыт — гэта сьпеў
вясны
ў маіх жылах і сэрцы,
такі кіпучы, бы пыл
на Лідскай дарозе

твой нябыт — гэта сонечны
прамень,
што песьціць мае валасы
перад навальніцаю
твой нябыт — гэта **Я**.

## Андрэй ПЯТКЕВІЧ

### НОВЫ ГОД

* * *

Б 'юць куранты над
Масквою,
Новы год прыйшоў да нас;
Зычуць жыцце залатое,
Зычуць шчаслівейшы час.

Навакол спяваюць песні,
П 'юць гарэлку ды віно;
Станеш, вокал азірнешся—
Штосьці шчасця ня відно.

Абяцаюць, абяцаюць,
Будуць грушы на вярбе.
Абяцаюць, а што маюць?
Усё сабе, сабе, сабе.

Смех ды радасць у
народзе —
Над Масквой куранты
б 'юць.
Дык ці ж возьмем ў
Новым годзе
У абяцанках што даюць.

Налівай, народ, гарэлку,
Прапівай свой Новы год.
Але заўтра нас сустрэнуць
Сто мінулашніх клапот.

Заўтра зноў круціцца
будзем,
Як ваверка ў калясе.
Дык калі ж, нарэшце,
цуды
Новы год нам прынясе?

## *С. МІНСКЕВІЧ.*

* * *

*Тваe спакусы прадаюцца,*
*Як кідкі фатаздымак.*
*Але ты цёплая*
*гола-графія.*
*І я бяру нятанна.*
*У чоўне ночы*
*На прасцягах прасціpадла*
*Я буду прагна іх згрызаць.*

* * *

*Я цалкам у ажуры*
*Я палю цыгарэты «Кэмэл»*
*Я праз зубы плюю*
*ў залаты ўнітаз*
*Ля ганка пыхціць мой*
*«Мэрсэдэс»*
*Я ў смочкі цалую супер*
*сэкс-бомбу*
*Я п 'ю «Залатое кальцо»*
*і глытаю ікру.*
*Я каханай прыношу*
*ў падарунак банан*
*і ананас*
*Я лію ёй на шыю парфуму*
*«Шанель»*
*Я рагачу, калі плачуць*
*ад суму*
*Я чую толькі вялікія*
*тэрцыі*
*Я цалкам у мажоры*
*Я — аптыміст.*

## Юры ГУМЯНЮК

### ЭПІЦЭНТР

Калыхаюся я ў эпіцэнтры
грамафона, які яшчэ грае,
мне пляваць на пустыя працэнты
нараджэньня сляпых самураяў.

Бо галоўнае — гукі ў паветры,
што нясуць нашы душы на поўнач.
І ня трэба лічыць кіламетры,
мы прыпынімся хуценька побач

Моцнай сваркі, якая пілуе
маё «Я» на чатыры кавалкі.
А кавалкі са сьвятам віншуюць,
спакушаюць, нібыта русалкі.

Не спатрэбіцца этнаграфічнасьць
Я дакладна ужо ведаю сутнасьць,
што сьвядомасць кабеты міфічна,
ну а піць па-сапраўднаму — сумна.

І таму эпіцэнтр грамафона—
гэта лепшая ў свеце кватэра,
дзе зьнішчае дурныя законы
куртызна зь мянушкай Халера.

### ЗЯЛЁНАЕ ВОКА

Зялёнае вока, як люстра ў аўторак,
згадаць — не згадаеш, вядомая справа.
Штодня ўспамінаецца цёплае мора—
налева, направа.
Зьмярцьвелыя сны, апантаны гадзіньнік,
што 6 на 12, што 8 на 10.
Чакаеш сумленна на зоркавы вынік:
зьнясуць галаву ці павесяць!
А вока зялёнае ў дробным кілішку,
нібыта кавалачак цукру ў гарбаце...
Спалі гэту кніжку,
шаноўны мой браце,
спалі гэту кніжку,
шаноўны мой браце.

### БУТЭЛЬКА

Хварэе паэзія ў тлустай бутэльцы.
Блішчаць яе вочы праз сіняе шкельца.
Ня ведаю як падтрымаць гаспадыню:
падаць ёй гарбуз ці мо жоўтую дыню!
Тым часам зьнікаюць пясчаныя горы.
Зямлю захапляе касьмічнае мора.
Мы молімся ціха ў зялёным сутоньні,
І кожны трымае бурштын на далоні.
А кожны бурштын нам нагадвае шкельца.
А кожнае шкельца, як муза ў бытэльцы.



### АГНІСТЫ МАК

На гэтым белым прасцірадле
нічога не расце
ліхія кіпарысы дзе-нідзе
збіраюць раду
я вельмі рады
што нарэшце
на гэтым белым прасцірадле
адбыўся цуд.
Пакінем абыякавасць і бруд
легенды і падманлівае радыё
рапсоды апоўначы
аднак
на гэтым белым прасцірадле

расце НІЧОГА проста так
а дакладней — агністы мак.

## *Мікола КАСЬЦЮКЕВІЧ*

### *НАЧНЫ СУСЬВЕТ*

*Дрыготкі вогненны дыск павольна ўцягваецца за бірузовыя хвалі далягляду, і шэры вэлюм паўзмроку ператвараецца ў змрочны паркаль.*

*Абцяжараны бясконцасьцю, з глыбінь сусьвету прыляцеў і накрыў зямлю празрыста-чорнымі крыламі вялізны птах ночы. З-пад калматага пер 'я яскравіцца месяц — амулет, і зорныя вочы сьлёзна вышукваюць запозьненую ахвяру, усхваляваную водсьветам дзённага хараства.*

*Ноч... Сумная музыка ночы... Палеглыя ў магілах мараць пра пакінуўшыя іх душы, жывыя ў ложках і ля вогнішчаў выношваюць чырвань ранішняга росквіту. і ўсе нямеюць музыкай ночы...*

*Затое звон цішыні аглушае адключэннем рэальнага сьветаўспрымання.*

*Вецер люляе лісьце дрэў на кладах, дзе спачыла пульсаваньне продкаў. Ціха ўздыхае галлё, а на сэрцы камянее шчымлівы смутак па нязбытнаму, жахлівей за які толькі туга па мёртвых. Няма нічога больш невыноснага за тугу па мёртвых...*

*Неспрактыкаваная ружа ў грудзях безнадзейна сівее і мелодыя душы разгублена мітусіца ў далёка-далёка, да згубленых*

*У самыя патаемныя куткі чалавечага «Я» холадна ўліваецца вязкае адчуванне імгненнасці подыху жыцця, спасьцігаецца сутнасьць вар 'яцтва, а ў тумане вачэй зьяўляецца цень тагасьветнае журбы.*

*Ты — чалавек... Ты такі слабы і сьмяротны... Дзіця адлічаных часам дзён. Пясчынка пустэльні, якая нема вішчыць абцасам наканаванасьці. Што жыццё чалавечае ў гэтым бяздонным віры зямнога быцця, куды бязьлітасна сьцягваюцца і шалеюць лёсы? Незаўважная асаблівасьць у невыразных абрысах вех, што стаяць на ўсім працягу існавання чалавецтва, маленькая, мізэрная зорачка, што бліщчыць пераліваmі свайго адчаю ў адвечнай цемры неба...*

*Адзінота зыркаціць спакусай і ў ледзяной цішы адчужэньня пачынаюць выразна гучаць рытмы закаханага сэрца, бясьсільнага ўжо ў сваёй роспачы аб 'яднаць час і сагрэць прастору. І страшэнная сіла сьлепіць розум, няўмольна падхоплівае і нясе некуды ў невымерную зорную вышыню, дзе мроіцца нешта атрутнасалодкае, згубнае і прыцягальнае, як боязь прыгажосьці за таямнічасьцю няпэўнасьці. І яшчэ вышэй, у немагчымую пазамежнасьць, дзе, расінуўшы рукі, ляціць Залаты Бог. Ён вабіць пустаце выпадковасьці.*

*высьпаў запаветнае зямлі — краіны вечнага юнацтва і душэўнай раўнавагі, жыхары якой валодаюць патаемнымі ведамі і мудрасцю, недаступнай простым сьмяротным...*

### *ПУЛЬСАЦЫЯ КАХАНЬНЯ*

*Кожны ўдар сэрца — гэта пульсацыя планеты ў сусьвеце каханьня, дзе немасьць болю расьцякаецца ў чарнату касьмічнае пакуты.*

*Адзін... Паміж нашымі планетамі халодная бясконцасьць выпадковасьцей. Зорны аркестр мігціць у такт страце і поўнач зьдзекуецца з маёй адзіноты пранізьлівымі скрыпкамі—прамянямі недасягальных зорак.*

*Сустрэча зь ідэалам здолела перацісьнуць аорту недаверу на сэрцы заўсёднага адчужэньня. Істотнае ўвасабленне мары глядзела ў зьнепрытомленую душу прызыўнымі вачыма, а я быў нерашучым, бо баяўся стаць тагасьветным.*

*Яна засталася па-за часам, які цяпер безнадзейна завітвае на агеньчык у маіх далонях. Кожны тужлівы ўздых цыгарэты аддаецца рэхам яшчэ аднаго кроку да вышэйшае асалоды жаданага забыцьця — сьмерці.*

*Яна засталася па-за межамі майго існавання, якое адразу згубіла сэнс. Бо немагчыма расьпяцце духу без узаемнага адчування плоці.*

*Цьвікі, атручаныя іржой немагчымасьці, мацуюць мае цела да крыжа адзіноты, што парахнее ў росквіце самотнага пустазельля.*

*Нястрымна-пакутлівае памкненне да пазамежнасьці ядавітай крывёй бруіцца ў венах надзеі.*

*Пякучыя птахі-ўспаміны сутаргава ляцяць на сьвятло летуценьняў праз цемру рэальнасьці.*

*Я губляю сьвядомасьць і прыходжу да яснага разуменьня недасканаласьці шчасьця, як першае ступені трагедыі звар 'яцелага каханьня. І няма прытомнасьці, здольнай запаліць адчай, каб асьвяціць дарогу ў мінулае.*

*Цьвярозае сьветаадчуваньне непазбежна, як узгадваньне будучага, і імклівыя моманты сучаснасьці пільна ўглядаюцца ў нявызначанасьць.*

*Ненароджаныя развагі саступаюць месца адчуваньню, бо кожная вяха разумення асэнсавана пазначаецца рысамі расчаравання на шляху ў глыбіню нікчэмнага.*

*Ілюзорны дотык да існасьці апёк рукі і самым жахлівым робіцца імгненьне, калі праз далоні пачынае сыпацца пясок будзённай мітусьні, што хавае амаль метафізічную ўзнёсласьць.*

*Знаходжаньне дня, як сьледства страты ночы... Адчай і надзея... Бясконцасьць...*



### *ЗАЛАТЫ БОГ*

*Ніхто так не маліўся Залатому Богу і не разумеў яго, як мы з табой. Сястра паўзмроку, ты прыходзіла ў жытло майго чаканьня, распальвала агмень шчодрасьці і чырвоныя водблiскі надзеі пачыналі гойсаць па цёмных сьценах будзённасьці.*

*Абалонкі душ гарэлі прагай зьліцця і ўзнёсласьці разбэшчана аддаваліся пачуццю пагарды ўсім, што замінала сугуччу.*

*Гарачы подых адданасьці плавіў воск розуму і кідаў у аргазм небыцьця. Але аднойчы неасьцярожны зварот да рэальнасьці разьбіў келіх еднасьці. Віно крыўды заліло полымя спагады і наркотык паўзмроку апьяніў непаразуменьнем.*

*Вэлюм адчужэньня закрыў агаленую ўзаемнасьць.*

*Безадказнасьць тлела падманам і падбіралася да выбуху расстаньня.*

*З адчаем разувер 'я мы паднялі бліскучае вечка няпэўнасьці і пачалі перабіраць клавішы стоенай сапраўднасьці.*

*Часам апошняя песьня зрывалася на стогн непазбежнасьці, і тады мелодыю падхопліваў вецер неабходнасьці. Ён роспачна ляманта ваў і шпурляў у расчыненае акно душы першыя лісты бясконцай журбы. Яны зжаўцелі ад горычы і пакінулі на вуснах сьлёзы безнадзейнае пяшчоты.*

*Пярсьцёнак развітання заручыў мяне з самотнымі ўспамінамі.*

*Толькі цяпло сусрэчы можа прабрацца ў храм каханьня, дзе цяпер пануе холад адзіноты.*

*Наш Залаты Бог, дзе ты?*

